# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 18 (67),10-16.05.2007 г.


# ІНВАЛІДЫ Ў АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА

## УЛАДЫ МАЮЦЬ НАМЕР СКАСАВАЦЬ УСЕ ЛЬГОТЫ

5 траўня, у Міжнародны дзень барацьбы інвалідаў за свае правы, у Мінску адбылася незвычайная акцыя пратэсту. Некалькі дзясяткаў чалавек у інвалідных калясках сабраліся на плошчы Бангалор, а адтуль нечакана рушылі праз цэнтр гораду да адміністрацыі прэзідэнта. Інваліды, апранутыя ў жоўтыя і аранжавыя майкі, адолелі сем кіламетраў, каб перадаць петыцыю кіраўніку дзяржавы. Міліцыя спрабавала перашкодзіць несанкцыянаванай акцыі. Міліцыянты спынялі каляскі, хапалі інвалідаў за рукі. Але ўсё ж тыя дасягнулі мэты.

Кіраўнік прыёмнай адміністрацыі прэзідэнта Пётр Катушкін прыняў некалькі чалавек і размаўляў з імі пару гадзінаў пра праблемы інвалідаў. Перад гэтым давялося выклікаць слесара, каб ён адчыніў другую створку ўваходных дзвярэй, бо інакш каляскі не маглі праехаць.

Нагодай да пратэсту стаў законапраект аб упарадкаванні льготаў, які закранае не толькі інвалідаў-калясачнікаў, але шмат якія катэгорыі насельніцтва.

Колькасць інвалідаў у Беларусі, якія стаяць на ўліку, перавышае паўмільёна чалавек. Плануецца, што інваліды 1-й і 2-й груп пазбавяцца 50-працэнтавых скідак на плату за тэлефон і на праезд унутры краіны з 1-га кастрычніка да 15 траўня (а таксама раз на год у іншы час), бясплатнай альбо льготнай пазачарговай устаноўкі тэлефона. Інваліды 3-й групы – 50-працэнтнай скідкі на лекі і бясплатнае пратэзаванне зубоў.

Пазбавяцца бясплатных лекаў дзеці да трох гадоў.

Ліквідацыю льготаў асабліва моцна адчуюць на сабе ветэраны вайны і былыя вязні канцлагераў. Для іх, зразумела, не застанецца незаўважным скасаванне 50-працэнтнай платы за камунальныя паслугі. Толькі за кошт гэтага ветэран, які жыве, скажам, у двухпакаёвай кватэры, эканоміў каля паўмільёна рублёў штогод.

Ударыць пазбаўленне льготаў і па студэнтах, у першую чаргу – іншагародніх. Усе льготы на праезд для гэтай катэгорыі грамадзянаў прапануецца таксама скасаваць.

Усіх ільготаў пазбавяцца і ліквідатары аварыі на ЧАЭС, ветэраны працы, іншыя катэгорыі грамадзянаў, якія патрабуюць сацыяльнай абароны.



**Акцыя пратэсту** *інвалідаў-калясачнікаў ля адміністрацыі прэзідэнта. Інваліды пратэстуюць супраць ліквідацыі льготаў. Мінск, 5 траўня 2007 году.*

Праз два дні пасля інцыдэнту з інвалідамі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам намесніцу кіраўніка адміністрацыі Наталлю Пяткевіч, якой даручана курыраваць законапраект аб скасаванні льготаў, ды запатрабаваў паскорыць яго прыняцце.

**Працяг – на стар. 3**

## ЧАМУ НЯМА АДЗІНСТВА СЯРОД НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СІЛ?

► СТАР. 2, 4

## БРОНЗАВЫ САЛДАТ І ДЭМАНТАЖ САВЕЦКАЙ ЭПОХІ

► СТАР.5

# ЧАМУ НЯМА АДЗІНСТВА Ў ШЭРАГАХ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛАЎ?

**ЗМІЦЕР БАНДАРЭНКА, КААРДЫНАТАР “ХАРТЫЯ’97”:**

## “У КРЫТЫЧНЫЯ МОМАНТЫ ПАРАЗУМЕННЯ БОЛЕЙ”

Адзінства, безумоўна, няма. Але ў крытычныя моманты, перад выбарамі, назіраецца, звычайна, большая здольнасць да паразумення. Тады ўдаецца аб’яднацца. Зараз да наступнай выбарчай кампаніі далёка. І таму настаў час пошуку адзінства, час пошуку падыходаў, стратэгіяў і гэтак далей. Але, на маю думку, у сітуацыі з кангрэсам нават стратэгія не распрацоўваецца. На жаль, гэта факт. І адзінства няма, і моцных стратэгій не бачна. І ўсё гэта адбываецца, калі градус у грамадстве расце. Як з эканамічных прычынаў, так і з палітычных. Сёння дэмакратычныя актывісты, у першую чаргу, маладзёвыя, значна мацнейшыя за лідэраў дэмакратычнага руху.

**ВАСІЛЬ, СТУДЭНТ:**

## “СЫТЫ ГАЛОДНАГА НЕ РАЗУМЕЕ”

Таму, што яшчэ як след не прыпякло. Аб’ядноўваюцца людзі тады, калі ім кепска. Вельмі спрыяюць згуртаванню нястачы і беды. Сытасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, у якім запланаваныя вояжы ў Страсбургі ды Брусэлі, не аб’ядноўваюць. А вось калі б замест Страсбурга свяціла Малое Сітна, як у Севярынца, тады б і жаданне аб’ядноўвацца абудзілася. Карацей, ізноў Лукашэнка вінаваты. Пры такім дыктатары можна жыць доўга і шчасліва.

**УЛАДЗІМІР КОЛАС, СТАРШЫНЯ РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ:**

## “ПАКУЛЬ ДОБРА ЖЫВЕЦЦА”

Напэўна таму, што надта добра яшчэ жывуць. І таму не думаюць і не робяць тое, што сапраўды трэба рабіць. А займаюцца крышку другаснымі справамі. Я маю на ўвазе асабістыя мэты, жаданні і амбіцыі, якія не дазваляюць аб’яднацца дзеля выканання агульных задач. Заўсёды цяжка карыстацца розумам. І гэта можна пра ўсіх беларусаў сказаць. Разуменне праблемаў не можа прымусіць рабіць правільныя высновы. А прыйдзе час, калі будзе ўжо запозна. Будзе значна цяжэй выпраўляць тое, што зараз можна выправіць. Батарэі грэюць, святло гарыць, вада цячэ і здаецца, што ўсё добра. А насамрэч мы праядаем сваю будучыню.

**НАСТАССЯ, НАСТАЎНІЦА:**

## “АДЗІНСТВА НЕ МОЖА БЫЦЬ СЯРОД ДЭМАКРАТАЎ”

Таму, што яго ня можа быць сярод дэмакратаў у прынцыпе. Якая павінна быць Беларусь у ягоным разуменні, Лукашэнка даводзіць нам кожны дзень. Калгасная, рускамоўная і зашуганая. А ў дэмакратаў ідэал Беларусі ў кожнага свой.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “СЛАБЫХ ЗАЎСЁДЫ РАЗ’ЯДНОЎВАЮЦЬ”

Таму, што слабых заўсёды раз’ядноўваюць. Адзінства магчымае толькі калі ёсць моц, калі ёсць упэўненасць і пэўная дасканаласць. Тады можна дамаўляцца. А паколькі ўсе людзі розныя, то, натуральна, поўнага адзінства не існуе ніколі. Гэта штучнае дасягненне, на якое здольныя толькі пэўныя асобы і пэўныя структуры. Не абы якія. А сённяшнія грамадскія структуры ў Беларусі наогул разбураныя, як у краіне, так і ў апазіцыі. Дзеці заўсёды сварацца, а дарослыя здольныя дамаўляцца і дасягаць пэўнага адзінства. Уявіце сям’ю, якую ўтвараюць двое падлеткаў. Гэта немагчыма, бо яны пасварацца адразу ж. А дарослыя час да часу, усё ж, утвараюць устойлівыя сем’і. Дасягаюць адзінства.

**РЫГОР, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “ДАВАЙЦЕ СКІНЕМСЯ ІМ НА ДАПАМОГУ”

Адзінства, можа, і не павінна быць. А вось чаму ў нас адна, самая галоўная сіла мацней за ўсе астатнія сілы, разам узятыя? І ўсе гэтыя маленькія сілы – што камуністы, што нацыяналісты, не могуць скаардынавацца ніяк. Бо канкуруюць больш паміж сабой. За грошы, за ўвагу. І калі вядзецца спрэчка пра тое, ці добра робіць Мілінкевіч – гэта проста смешна. Больш няма чаго абмяркоўваць у Беларусі. “Ты пасядзеў два месяцы, дай людзям пасядзець”. І уся думка не аб радзіме, але аб грантах. Адзінства няма нават не ў глабальных пытаннях, а — дзе сабрацца на мітынг. Нават ва ўлётках няма каардынацыі. Хто першым грошы схапіў, той і надрукаваў нейкае гідоцце з зялёным сцягам. А астатнія пачынаюць абурацца. А вырашыць, дзе канкрэтна збірацца, не могуць. Таму прапанова. Давайце ім плаціць грошы самі. Хай яны пра нас падумаюць, а не пра Еўрасаюз. Скінемся, хто колькі можа.

**АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА, ЛІДЭР АГП:**

## “ХТО ПРЫДУМАЎ ЖАРТ, ШТО НЯМА АДЗІНСТВА?”

Хто гэта прыдумаў такі жарт, што няма адзінства? Я якраз лічу, што апошнія рашэнні, якія прынятыя, яны сведчаць аб тым, што ёсць палітычная воля мець адзінства. Ці маецца на ўвазе адзінства, як пры Аляксандры Лукашэнку? Адна галава, адна думка, адна пазіцыя. Адзін гаворыць — усе ківаюць галовамі. Адзін дае каманду, усе маршыруюць. Ну калі пра такое адзінства, то яго няма. А калі пра адзіную стратэгію, адзінства пазітыўнай альтэрнатывы, адзінства жадання праводзіць кангрэс, то яно ёсць. Кожны мае права на дыскусію да таго часу, пакуль не прынятае рашэнне. У Вільні, на канферэнцыі, мы ўзялі на сябе пэўныя абавязкі. І калі палітыкі паважаюць саміх сябе, калі мы асобы, якія паважаюць тысячы іншых людзей, якія насамрэч чакаюць дзеянняў і адзінства, то ўсё павінна быць добра. І Мілінкевіч, і Калякін, і Вячорка, і Лябедзька – людзі адказныя. І гэта пацвердзіла прэзідэнцкая кампанія. Калі мы дамовіліся, мы аказаліся вышэй за эмоцыі і амбіцыі. І гэты пазітыўны досвед трэба працягваць і далей.

**АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ, ПАЛІТЫК:**

## “АДЗІНСТВА НЯМА СЯРОД ЛІДЭРАЎ”

Адзінства няма сярод шэрагу лідэраў у Мінску. А так, калі ездзіш па краіне, нармальнае адзінства. У большасці гарадоў людзі не толькі хочуць працаваць разам, але і ўмеюць. А ў Мінску няма адзінства з той прычыны, што розныя мэты ў розных лідэраў. А аб’яднанне будуецца на агульных каштоўнасцях і на аднолькавых мэтах. Тут ёсць праблема.

**Працяг тэмы на стар.4**

# ІНВАЛІДЫ Ў АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА

**Пачатак на стар. 1**

Як паведаміла прэзідэнцкая прэс-служба па выніках сустрэчы, “сістэма льготаў, створаная яшчэ за савецкім часам, не можа не мяняцца, асабліва ў цяперашніх эканамічных умовах. Не можа лічыцца нармальнай сітуацыя, калі больш за палову насельніцтва краіны – ільготнікі”.

Савецкая сістэма льготаў, натуральна, павінна мяняцца. Але спачатку старыя людзі і інваліды павінны атрымліваць пенсіі, якіх хапае і на кватрплату, і на прадукты, і на лекі, і на праезд. А галоўнае, іх дзеці павінны атрымліваць нармальныя заробкі.

Характэрна, што эканоміць дзяржава вырашыла на ветэранах, у вернасці савецкім ідэалам якіх увесь час дагэтуль кляўся Лукашэнка. І сярод якіх ён карыстаўся найбольшай падтрымкай.

Падарунак у выглядзе абяцання скасаваць усе льготы ветэраны атрымалі акурат напярэдадні Дня перамогі. Апошнімі днямі, аднак, дзяржаўная прэса больш была заклапочаная падзеямі ў Эстоніі, дзе, нібыта, зняважылі памяць ахвяраў мінулай вайны. Там помнік савецкаму салдату перанеслі з цэнтру Таліна на могілкі.

**Аглядальнік**

# НАПЕРАД, ФРАНЦЫЯ!

З перамогай на прэзідэнцкіх выбарах у Францыі Нікаля Сарказі адным з першых павіншаваў лідэр аб’яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандр Мілінкевіч. Летась у жніўні на запрашэнне Сарказі Мілінкевіч браў удзел у фестывалі моладзі ў Марсэлі.



*Нікаля Сарказі і Аляксандр Мілінкевіч. Архіўнае фота РС.*

У інтэрв’ю Радыё Свабода Мілінкевіч сказаў: “Для дэмакратычных сілаў Беларусі гэта вельмі важная перамога. Я думаю, што Францыя і новы прэзідэнт падтрымаюць цалкам тыя ўмовы, што выстаўляе Беларусі Еўрасаюз, падтрымае вельмі карысныя прапановы з боку Еўракамісіі. Усё залежыць, безумоўна, ад беларускіх уладаў. У іх ёсць добры шанец наладзіць супрацоўніцтва з Еўрасаюзам і Францыяй канкрэтна. Трэба рабіць крокі. І першы крок вельмі просты – вызваліць палітвязняў”.

Абодва кандыдаты ў прэзідэнты, што выйшлі ў другі тур (выбары адбыліся 6 траўня) – кансерватар Нікаля Сарказі і Сегален Руаяль нарадзіліся пасля вайны. Такое адбылося ўпершыню ў сучаснай гісторыі Францыі. Сарказі нарадзіўся ў 1955-м годзе ў сям’і эмігранта з Венгрыі і французжанкі габрэйскага паходжання, гэта таксама незвычайны для Францыі факт. Ягоным папярэднікам на пасадзе прэзідэнта быў Жак Шырак. Пры ім Сарказі ў апошнія гады ўзначальваў Міністэрства ўнутраных справаў. Падчас выбарчай кампаніі Сарказі недвухсэнсоўна выказаўся ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі.

Ці не таму Аляксандр Лукашэнка “забыўся” павіншаваць новага прэзідэнта з абраннем?

**Паводле СМІ**

# У ПІСЬМЕННІКАЎ ЗАБРАЛІ МАЁМАСЦЬ

Вярхоўны суд Беларусі задаволіў пазоў Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі грамадскага аб“яднання «Беларускі літаратурны фонд» (БЛФ).

У студзені 2006 году Мінюст вынес БЛФ пісьмовае папярэджанне за выкарыстанне бланкаў, пячатак і эмблемы, якія не адпавядалі патрабаванням заканадаўства. Адразу пасля гэтага Мінюст вынес грамадскаму аб“яднанню паўторнае папярэджанне нібыта з прычыны адсутнасці ў арганізацыі належнага ўліку сваіх сяброў і парушэння статуту пры правядзенні агульнага сходу БЛФ.

Існуюць планы перадачы маёмасці літфонда новастворанаму прыўладнаму Саюзу пісьменнікаў Беларусі.

**Паводле СМІ**

## СУСЕДЗІ

# НА ВАЙНЕ ЯК НА ВАЙНЕ

Днямі выпадкова завітаў на выставу “СМІ Беларусі”. Выстава адчынілася 2 траўня – напярэдадні Міжнароднага дня свабоды друку. Але да свабоды прэсы яна дачыненя яўна не мела. Здзівіла вялікая колькасць вайсковых атрыбутаў. Да Дня Перамогі заставаўся яшчэ амаль тыдзень, а па экспацэнтры шпацыравалі жанчыны ў строях колеру хакі. Да таго ж, наведнікам дэманстраваўся старажытны матацыкл, на калясцы якога быў усталяваны кулямёт.

І раптам падумалася, што якраз да гэтага мерапрыемства вайсковыя рэчы пасуюць. Бо на выставе прысутнічалі амаль выключна дзяржаўныя СМІ. А яны, па сутнасці сваёй, застаюцца баявымі лісткамі.

Вайна прысутнічае нават у спартыўных тэлерэпартажах. 7 траўня Уладзімір Навіцкі, каментатар хакейнага матча Беларусь-Германія на чэмпіянаце свету бясконца праводзіў паралелі паміж спаборніцтвам на лядовай пляцоўцы і... Вялікай Айчыннай вайной. Маўляў, напэрэдадні святога Дня Перамогі нашы абавязаны дамагчыся поспеху.

Праваабарончая арганізацыя “Фрыдам хаўс” апублікавала штогадовы рэйтынг свабоды прэсы ў краінах свету. Беларусь звыкла ўзначальвае першую дзесятку… з канца. Разам з Самалі, дзе акурат у разгары грамадзянская вайна. Апошняе, 195-е месца, заняла Паўночная Карэя. З краінаў СНД ніжэй за Беларусь толькі Туркменістан з Узбекістанам. Праўда, і Расія гэтым разам не нашмат вышэй – на 164–м месцы. Украіна на 112-м, але яна трапляе ўжо ў разрад часткова свабодных. А вось прэса заходніх нашых суседзяў цалкам свабодная. Польшча заняла 22-е месца, Латвія і Літва патрапілі ў першую трыццатку. Эстонія – на 16-м. Ну, а першае месца дзеляць Фінляндыя з Ісландыяй.

**Валер Філін**

# ЯК НАМ З ЧАСТАК САБРАЦЬ РУХАВІК?

## ПЫТАННЕ АДЗІНСТВА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ СІЛ ЗАСТАЕЦЦА АДКРЫТЫМ

Заўважу адразу – апытанння ў гэтым нумары не атрымалася. Кожны, думаючы пра адзінства, разважаў пра нешта сваё, асобнае або пра даўно загаворанае ў кулуарах суперніцтва лідэраў апазіцыі. Але ж мы пыталіся не пра тое. Вызначэнне “нацыянальна-дэмакратычныя сілы” ўсе палітыкі без разваг аднеслі да сябе. Хоць і палова з іх ніяк не можа быць названая “нацыянал-дэмакратамі”. Пра што ж было наша апытанне?

Беларусь сёння не мае адзінай магутнай нацыянальнай ідэі і, як вынік, не мае адзінага магутнага нацыянальнага руху. Прыродныя і дэкляраваныя прадстаўнікі гэтай ідэі і гэтага руху – творчая інтэлігенцыя, навукоўцы, педагогі, журналісты недзяржаўных беларускіх СМІ, два народныя і адзін малады франты... Словам, усе тыя, хто ў поўнай меры адпавядаюць найменню “нацыянальны дэмакрат”. Ён гаворыць і гадуе дзяцей па-беларуску, вызнае незалежную версію айчыннай гісторыі, любіць і ведае беларускую культуру і бачыць свой народ сярод іншых еўрапейскіх народаў. Такі чалавек сёння разглядаецца ўладамі як апазіцыянер ці нават як вораг, бо найменшае ўзаемапранікненне яго- най і афіцыйнай ідэалогіі недапушчальнае. Зразумела чаму. Праўдзівая нацыянальная ідэя зараз жа высветліць фальшывасць ідэалогіі рэжыму.

Што да аб’яднанай апазіцыі, дык яна не так страшыць аўтарытарнага кіраўніка, бо не мае і не можа мець адзінай магутнай стваральнай ідэі, як не можа быць адзінага бачання будучае Беларусі ў камуніста, нацыяналіста і правінцыйнага лібերала. А значыць, не можа даць адзінага стваральнага руху. Таму нацыянальна-дэмакратычныя сілы і аб’яднаная апазіцыя – паняткі не толькі не тоесныя, але прынцыпова розныя. Што да нашага пытання, дык яно тычылася выключна першых.



www.tiahnybok.info

Чаму сёння найменш адзінства менавіта сярод тых, хто мае адзіныя ідэйныя мэты і адзінае бачанне Беларусі? Інакш кажучы, чаму найбольш разрозненым, разабраным на часткі ў нас аказаўся адзіны механізм вываду краіны з аўтарытарнага тупіку?

Няма сумневу, што кіраўнік краіны і яго падначаленыя выдатна разумеюць, што менавіта гэты механізм складае для іх улады найбольшую пагрозу. Таму спецслужбы найболей шчыруюць акурат вакол гэтага рухавіка. Самі апазіцыянеры прызнаюцца, што ў іх радах хутка большасць будуць складаць “мечаныя”. У такім выглядзе партыі працягваюць існаваць. А, да прыкладу, Інстытут гісторыі Акадэміі навук фактычна існаваць перастаў, бо там “мечаныя” ўжо набралі крытычную масу, што паралізавала і навуку і навуковую працу. Саюз пісьменнікаў ператвораны ў пахаджанаў і таксама ходзіць па лязу нябыту. Рок-гурты даўно не выпускаюцца на вялікія сцэны. А гэта ўсё – галоўныя фактары стварэння нацыянальна-дэмакратычнай плыні ў палітыцы, распрацоўкі нацыянальнае ідэі, на базе якой мог бы стварыцца нацыянальны рух. Гэтых, у адрозненне ад партый, улада не церпіць.

Больш за тое, вызваленыя ад рэальных навукоўцаў ды культурнікаў пляцоўкі зараз жа запаўняюцца сурагатам, а сама культура і гуманітарная навука бязлітасна прафануецца. Звярніце ўвагу на тое, *што* сёння дзяржаўныя СМІ называюць культурай і *што* прапануюць “аматарам высокага мастацтва”. З партыямі такіх падменаў не праводзіцца, бо партыі не з’яўляюцца крыніцай нацыянальнай ідэі – самага небяспечнага супраціву рэжыму.

Асобна і адстаронена існуюць беларускія рэлігійныя суполкі, журналісцкія калектывы, навуковыя, маладзёвыя ды ўсякія іншыя ўтварэнні, зместам дзейнасці якіх ёсць дэмакратычная еўрапейская беларуская Беларусь. Неяк усё робіцца так, каб ідэя, якая, верагодна, магла б злучыць іх усіх у адно, не прагаворвалася, не паказвалася, не высоўвалася на свет божы. Нібыта месца гэтай ідэі – пустое, а значыць, на ім можна размяшчаць усялякую іншую праблематыку: ад узаемадачыненняў партыйных лідэраў да апошняга дасягнення “беларускіх дэмакратаў” – заклiку далучыць Беларусь да Расіі.

Найбольш карысны вынік сённяшняга апытання нават не ў тым, што многія палітыкі не змушаюць сябе роздумам над фармулёўкамі, а ў тым, што мы выразна ўбачылі, што словы “адзінства”, “нацыянальны” і “дэмакратыя” размытыя ад частага і прыблізнага ўжывання. Яны страцілі свой сэнс. Калі ўлады сталі называць нацыянальным тое, адкуль перад тым дарэшты вымяталі ўсё нацыянальнае, дык у апазіцыі ў ліку дэмакратаў з’явіліся камуністы, а незалежныя СМІ працягваюць беларускім прэзідэнтам і беларускім урадам называць антыбеларускіх паводле іх нацыянальнай сутнасці чыноўнікаў. “Чым горш, тым лепш” – казаў Мао Цзэдун. Колькі існуе свет, столькі таталітарныя рэжымы імкнуцца заблытаць простыя словы і простыя сэнсы. І столькі ж апазіцыйная інтэлігенцыя пачынае сваё супрацьстаянне заклікам: “Называць рэчы сваімі імёнамі”.

Можа быць, і нам прыйшоў час заўважыць, што наша “аб’яднаная дэмакратыя”, пазбаўленая галоўнага – агульнай стваральнай ідэі – даўно ператварылася ў “аб’яднаную бюракратыю”? І цяпер яна чарговае новае пакаленне ахвочых да перамен павядзе ў тую самую яміну апатыі, дзе ўжо апынуўся папярэдні “дэмакратычны” прызыў.

У прынцыпе, пытанне пра адзінства Мілінкевіча і Лябедзькі для грамадства не стаіць і не стаяла ніколі. А вось пытанне адзінства ў нацыянальнай ідэі і ў нацыянальным руху, якое нашы палітыкі сарамліва не прагаворваюць на мітынгах і кангрэсах, застаецца адкрытым. Можа быць новае пакаленне святкаўнікоў Дня Волі не ўпусціць свайго шанцу і паспее да таго часу, як западзе ў апатыю, наладзіць гэты разабраны на часткі рухавік нацыянальнай ідэі і нацыянальнага руху?

**Алесь Кебік**

# ДЭМАНТАЖ ЭПОХІ

## УЛАДЫ РБ АБАРАНЯЮЦЬ САВЕЦКІЯ МІФЫ

Сярод тых, хто загінуў пры вызваленні Эстоніі ад гітлераўскіх войскаў, былі беларусы. А таксама расейцы, украінцы, таджыкі, яўрэі, эстонцы, нават немцы. Але гэты хрэстаматыйны факт савецкай гісторыі крамлёўскія прапагандысты сёння не згадваюць. Перанос бронзавага салдата з цэнтру Таліна на вайсковыя могілкі ветэраны вайны, палітыкі, чыноўнікі розных рангаў у Маскве называюць абразай расійскага народу, знявагай іхняга патрыятызму.

Што ж тычыцца піяр-кампаніі расійскіх уладаў у сувязі з планамі пераносу помніка савецкім салдатам (дарэчы, аўтар яго – эстонскі скульптар), дык вынік яе пераўзышоў усе чаканні. Акцыі пратэсту расійскамоўнай абшчыны Таліна выліліся ў бунт – "бессэнсоўны і бязлітасны". Моладзь біла вітрыны, грамілa і рабавала крамы ў цэнтры Таліна. Хапалі ўсё, што трапляла пад руку – у асноўным алкаголь і харчы. Толькі ў разгромленай кнігарні не ўзялі ніводнай кніжкі.

Наколькі адэкватнай была рэакцыя эстонскай паліцыі (у якой служыць шмат расійскамоўных грамадзянаў Эстоніі)? Пра гэта можна запытацца ва ўдзельнікаў акцыяў беларускай апазіцыі, якія не раз паспыталі на сабе і дручкі, і кайданкі, і слезацечны газ, і шумавыя гранаты. Якіх арыштоўвалі дзесяткамі і нават сотнямі – як падчас пратэсту на Плошчы. І якія пры гэтым перагарнулі аднойчы ў цэнтры Мінска толькі адну міліцэйскую аўтамашыну – гэта здарылася больш за дзесяць гадоў таму.

У Маскве актывісты пракрамлёўскага руху "Нашы" блакавалі пасольства Эстоніі, фактычна спыніўшы на тыдзень яго дзейнасць. Але да разрыву дыпадносінаў не дайшло. Больш за тое – не было ніякіх санкцыяў, як, скажам, у выпадку з Грузіяй ці Малдовай. Гаварыць пра байкот эстонскіх сыроў проста смешна.

Занадта шмат, відаць, інтарэсаў расійскай буржуазіі ў краінах Балтыі. Мэр Масквы Лужкоў, напрыклад, які публічна заклікаў расійскі бізнес спыніць усе дачыненні з эстонскім, застаецца буйным акцыянерам аднаго з банкаў Эстоніі. Так што пасля прыступу істэрыі ў маскоўскіх СМІ справу пачалі паціху спускаць на тармазах.

У Мінску тым часам улады дзейнічаюць пад чужую капірку, узяўшы за ўзор для пераймання акцыю "нашыстаў". Наш, прабачце за каламбур, БРСМ папугайскім чынам ладзіць разам з ветэранскімі арганізацыямі пікет каля генеральнага консульства Эстоніі. Раней будынку консульства ўжо дасталася ад нацболаў (таксама нашых?), якія пераблыталі яго з консульствам Латвіі. У выніку эстонскае консульства вымушанае зараз прыпыніць выдачу візаў.

Абвінавачанні бээрэсэмаўцаў і ветэранаў ў бок заходніх еўрасаюзаўскіх орагаў стандартныя – эстонцаў вінавацяць у фашызме.

Колькі разоў перад тым у Мінску апаганьваўся мемарыял на Яме – месцы расстрэлу вязняў гета. Малявалі свастыку, аблівалі помнікі чорнай фарбай. Ніякай рэакцыі з боку ўладаў. Ніхто не пакараны. Ніхто не пакараны і за акты вандалізму ў Курапатах, дзе сталінскія каты расстрэльвалі людзей аж да лета 1941 году.

Наадварот, у краіне штодзённа ўшаноўваюць Сталіна. "Лінія Сталіна", дзе ўсталяваны бюст генералісімуса, сёння зрабілася ці не галоўнай турыстычнай мекай сучаснай Беларусі.

Гэта даніна памяці геніяльнаму стратэгу, у выніку кіраўніцтва якога ў першыя дні вайны толькі пад Мінскам траілі ў палон 30 савецкіх дывізій – 323 тысячы чалавек. Агульныя ж людскія страты Заходняга фронту склалі 418 тысяч чалавек.

Паводле нямецкага гісторыка Ханеса Вальтэра, у Эстоніі падчас вайны савецкія войскі страцілі да 170 тысяч чалавек забітымі. Немцы – да 45 тысяч.

Як вядома, перад вайной Сталін, дамовіўшыся з Гітлерам, забраў, сярод іншых тэрыторыяў, краіны Прыбалтыкі. У 1940 годзе з Эстоніі былі дэпартаваныя 10 тысяч чалавек, звыш 2-х тысяч расстраляныя. (Столькі ж грамадзянаў Эстоніі было расстраляна падчас нямецкай акупацыі.) Пасля аднаўлення савецкай улады былі дэпартаваныя яшчэ 20 тысяч эстонцаў, 80 тысяч эміграваліі.

Як жа павінны ставіцца ў Эстоніі, іншых краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы да савецкай арміі, якая, вызваліўшы іх ад гітлераўскай акупацыі, прынесла на сваіх штыках сталінскае рабства?

У Крамлі сёння не хочуць успамінаць ахвяры сталінскіх рэпрэсіяў. Там неахвотна, скрозь зубы прызнаюць і сам факт незалежнасці прыбалтыйскіх краінаў да вайны і іх акупацыі. Кіраўніцтва Расіі ўсё меней гаворыць і пра перамогу над фашызмам. І ўсе болей – пра перамогу расійскага народа ў Вялікай айчыннай вайне.

Першым аб гэтым загаварыў таксама Сталін. 24 чэрвеня 1945 году ў Маскве ён прапанаваў тост: "Я п'ю, перш за ўсё, за здароўе расійскага народа, таму што ён з'яўляецца найбольш выдатнай нацыяй з усіх нацыяў, што ўваходзяць у склад Савецкага Саюза". Сёння Лукашэнка, як і Пуцін, пры кожнай нагодзе і без нагоды паўтарае, што расейцы з беларусамі — адзін народ.

Здаецца, сёння запаветам Сталіна захоўваюць вернасць не толькі ў Маскве, але і ў Мінску, увесь час вольна ці нявольна падкрэсліваючы расійскі вялікадзяржаўны падыход да гісторыі ды сучаснасці. Яшчэ адным сведчаннем таму сталася адкрыццё помніка маршалу Жукаву ў Мінску.

З усіх аспектаў мінулай вайны некрытычна бярэцца на ўзбраенне толькі адзін – геразм савецкага салдата. Што на справе сёння выліваецца ў геразацыю сталінізму і савецкага таталітарызму.

У Эстоніі, што б хто ні казаў, з дэмантажом бронзавага салдата савецкая эпоха скончылася назаўжды. У Беларусі дэмантаж сталінізму яшчэ нават не пачынаўся.

**А. Уласаў**

*P.S.*

8 траўня, калі ў Еўропе адзначаецца Дзень перамогі над нацызмам, урадавая дэлегацыя Эстоніі на чале з прэм'ер-міністрам усклала вянок да перанесенага на могілкі помніка. У цырымоніі ўдзельнічалі замежныя дыпламаты. За выключэннем расійскіх.

**А.У.**




*Пікет ля консульства Эстоніі. Мінск, травень 2007 году.*

Саюздрук

# НА ДАЧУ – НА “ДАЧЫ”

## АЛЬБО НАСТАЛЬГІЯ КУЛЬТУРНАГА АКУПАНТА

Вельмі своеасабліва ўспрынялі ў “Советской Белоруссии” перамогу Нікаля Сарказі на прэзідэнцкіх выбарах у Францыі. Нават убачылі нейкія паралелі паміж Парыжам і Мінскам.

*"Глядя из Минска на то, как употребляет Саркози буквально с первых минут свою власть, нельзя отделаться от неких параллелей. Николя Саркози, в отличие от нежной и обаятельной Сеголен Руаяль, вовсе не был любимчиком всех политических сил. Некоторые называли его (и называют в эти дни) даже «фашистом»... То есть налицо жесткая политическая конфронтация. Но! Смотрите, как проявляет себя французская демократия: «Выбор сделан!» — сказано сегодня противникам нового президента. И после того, как закрыты избирательные участки, кулаками не машут. Президент имеет право наводить порядок в интересах большинства. И никаких стояний на площади. Саркози без сомнений посылает полицию со слезоточивым газом и дубинками против тех, кто проявляет неповиновение выбору французского народа. Будь в Париже похолоднее и кто–то решился бы установить «палаточный городок» — жестко разгромил бы и его. И никто в Европе слова не скажет..."*

Па-першае, Сарказі прэзідэнтам стане толькі 16-га траўня. Пакуль ён адпачывае на Мальце разам з сям’ёй, ягоны папярэднік Жак Шырак спакойна працягвае выконваць свае абавязкі.

А парадак на вуліцах наводзіць не асабіста кіраўнік дзяржавы, як гэта ні падасца дзіўным “СБ”, а паліцыя – строга ў рамках закона і сваіх прафесійных абавязкаў.

Акрамя таго, шаноўныя чытачы, прыгадайце, калі ласка, колькі машынаў было спалена ў Мінску леташняй вясной і колькі разбіта вітрынаў? Ці, можа, сярод вашых знаёмых ёсць эмігранты з Афрыкі, якія не хочуць інтэгравацца ў беларускае грамадства і прымаць беларускую культуру? Выглядае на тое, што ў ролі “некультурных эмігрантаў” выступаюць якраз сённяшнія ўлады Беларусі.

А Віктар Чыкін у “7 днях” тым часам сваім палымяным пяром зрывае маскі з эстонскіх уладаў.

*“Для моего поколения Прибалтика была чем–то вроде заграницы. Мы любили ездить в Вильнюс, Ригу и Таллин, чтобы окунуться в неповторимую атмосферу этих городов, побродить по их узким улочкам, посидеть в уютных кафе. Тогда нам казалось, что в Прибалтике живут более культурные, более воспитанные, более цивилизованные люди, чем в наших краях... Одним словом, настоящие европейцы. Какими же наивными были мы тогда!*

*На прошлой неделе Прибалтийская Европа показала всему миру свое истинное лицо, и, оказалось, что оно, как две капли воды похоже на лицо... фанатика-талиба. В Афганистане талибские дикари-экстремисты несколькими выстрелами из гранатомета «демонтировали» включенную во Всемирный список культурного наследия ЮНЕСКО статую Будды. В Эстонии просвещенные европейцы, хоть и обошлись без противотанковых средств, но «Бронзового солдата» (первоначально монумент освободителям Таллина) снесли не менее оперативно, чем их бородатые братья по разуму из Талибана.*

*…Представьте себе, какие иерихонские трубы прозвучали бы из евроструктур, если бы подобное произошло не в Таллине, а в Минске”.*

Параўнаць помнік салдату са статуяй Буды – гэта крута. Але яшчэ больш уражвае хлусня з вуснаў камуністычных “абвінаваўцаў”, якія сумуюць па ўтульных кавярнях “амаль што за мяжой”, дзе яны маглі за савецкім часам “культурна” размаўляць парасійску. Што працягваюць рабіць і цяпер у Беларусі.

Але справа не ў гэтым. Хіба “бронзавы салдат” у Таліне знішчаны? Не. І парэшткі жаўнераў, няма сумневу, будуць належным чынам паразахаваныя. І могілкі, на якіх яны знойдуць, нарэшце, свой спакой, будуць даглядацца належным чынам.

А наконт “падобнага ў нас” я б на месцы спадара Чыкіна сціпла прамаўчаў. Мы на брацкіх магілах дарогі будуем, як у Курапатах. Альбо шыкоўныя дамы для начальства, як у раёне Старажоўкі ў Мінску, дзе пахаваныя парэшткі салдатаў першай сусветнай.

А “Народная газета” вырашыла парадаваць сваіх чытачоў весткамі з аўтакірмаша “Маторшоў”.

*“Сказать, что все из представленных авто интересны — нельзя, но каждый найдет машину по потребностям. Кто-то оценивающе присядет в новинку от “Ауди” — R8 стоит около 100 тысяч евро, или в представительский класс от “Мерседес” в 120 тысяч евро (вроде как самая дорогая машина выставки). Другие присмотрят что-нибудь более подходящее по соотношению цена — качество, например, популярную сегодня “Дача-Логан” за 7 тысяч евро. В общем — идите и выбирайте”.*

Выбірайце, шаноўныя. А галоўнае, не спазніцеся купіць тую “Аўдзі” R8. А не то, глядзіш, сусед па пад’ездзе, таксама чытач “НГ”, вас апярэдзіць. І прыйдзецца на дачу ездзіць на нейкай “Дачы” ўсяго за сем штук еўра. Што ні кажы, а назву сваю “Народная газета” апраўдвае.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# “ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ”

## АЛЬБО Ў ПОШУКАХ УСХОДНЯЙ ДЗВІНЫ

Трэцяга траўня ў свеце адзначылі Дзень свабоды слова. Я раней пісаў ужо, што нашы вольныя радыёстанцыі, бывае, ігнаруюць святочныя дні. Выказваў пажаданне, каб у святочны дзень гучалі адмысловыя праграмы. І вось, прыемна адзначыць, што на Радыё “Свабода” Дзень свабоды слова заўважылі і прысвяцілі яму шмат цікавых сюжэтаў. Спадабалася гутарка з Жанай Літвіной, старшынёй Беларускай асацыяцыі журналістаў. Спецыяльна была перакроена традыцыйная праграма перадач і ў эфір пайшоў адмысловы “круглы стол” з супрацоўнікамі рэдакцыі. І што самае для мяне прыемнае, заўважылі нашу газету і нашу рубрыку: працытавалі гімн-верш “Люблю я Радыё Свабода” нашага віленскага аўтара Сцяпана Дзінь-Дзілевіча. Шкада толькі, што ў рэдакцыі не заўважылі, што гэта не толькі верш. Яшчэ яго можна спяваць на матыў песні “Люблю наш край”. Мару калі-небудзь пачуць гэтую песню ў эфіры ў выкананні вялікага хору.

Моўная заўвага. Паўтара месяца таму на Падзвінні здарылася аварыя нафтаправода. І вось цяпер, ужо другі раз, такая самая аварыя. Шкада забруджанай зямлі і вады, але я не пра экалогію, я пра мову. І тады, і цяпер усе журналісты называлі нашу славутую рэчку – Заходняя Дзвіна. А пры чым тут “Заходняя”? У нас у Беларусі ёсць толькі адна Дзвіна, так яе і называюць мясцовыя людзі – Дзвіна. А што там, на ўсходзе, цячэ яшчэ адна рэчка з падобнай называй, дык гэта не нашы праблемы.

**Сяржук Вітушка**

# ВАР'ЯТЫ

## ЯКІЯ ЯНЫ ЎСЕ МІЛЫЯ І БЯСКРЫЎДНЫЯ

Стрэмкі

Жыве ў нашай хаце трусачка Снежка. Звярок гэта лагодны і рахманы, а як жа інача, калі белы й пушысты. Ёсць у яе любімы занятак – што-небудзь грызці. І маем мы нізкую і цесную баковачку, куды зносім розны малапатрэбны хлуд. І заўважылі мы неяк – надта ж палюбіў наш вушасты сябар туды пранікаць. Толькі пачуе, што дзверцы скрыпнулі – шусь туды, і паўдня няма. І няхай сабе. Чым бы зайчык не цешыўся. Вяртаўся ён адтуль дужа задаволены, толькі пышчак быў заўсёды выпацканы ў нешта цагляна-чырвонае. Ніяк мы не маглі даўмецца, чаму.

І аднойчы, сярод ночы – бяссонніца! – працяла мяне здагадка. І падскочыў я, як уджалены, і кінуўся ў бакоўку ліхаманкава разграбаць ламачча... І апусціліся мае рукі ў роспачы – ад стосу маіх студэнцкіх малюнкаў, ад усяго архіву эскізаў засталася толькі горба папяровых кавалачкаў, – найбольшыя велічынёй з пазногаць... Суцешыў сябе толькі думкаю – а каму яны патрэбныя, раней загінулі, пазней – якая розніца?

Да таго ж, на вялікае шчасце, ацалеў найлепшы малюнак – аголеная фігура, акт натуршчыцы Альфрэды. Малюнак, якім я патаемна ганарыўся, і які ўдалося ўратаваць пасля прагляду ад "канфіскацыі" ў фонд кафедры малюнка. Вось дзе загінула найлепшых студыйных прац – без усякіх грызуноў, але бясследна...

Старанна я выштукаваў тады пругкае цела Альфрэды – чырвонай сангінай ды яшчэ графітным алоўкам. Як добра, што быў малюнак загорнуты ў таўстое палатно...

Жыла тая Альфрэда чым Бог пашле і дзе пасцеле. Нягледзячы на такі лад жыцця, мела дарослага ўжо сына Лаяша. Чаму імя венгерскае – хто ведае, як і многае пра гэтую пару было невядомым.

Ужо пасля сканчэння інстытута, ужо ў перабудовачна-рэвалюцыйныя часы сустрэлі мы неяк гэтую парачку, і пажаліліся яны нам, што не маюць даху над галавой, гаспадар выгнаў. Пашкадавалі мы, пусцілі да сябе. Не памятаю, колькі часу яны ў нас "кантаваліся", але ўелася нам у косці тая Альфрэда бясконцымі аповедамі пра тое, як яе пераследуе КГБ. Потым былі новыя сустрэчы, у самых нечаканых месцах, былая натуршчыца вырастала, нібы з-пад зямлі і, гледзячы ў вочы, даймала размовамі то пра сваю будучую эміграцыю ў Аўстралію, то пра ўціск ужо з боку літоўскіх "органаў". Мы хадзілі па вуліцы пастаянна насцярожаныя – каб своечасова збочыць, схавацца. Быў нейкі перыяд, калі перасталі яны нам трапляцца – і разам, і паасобку. Але дзе там – нядаўна каля аднаго касцёла падскочыла знаёмая, высахлая ўжо як таранка, фігурка... ледзь удалося ўцячы. Колькі гадоў прайшло, няма ўжо на свеце ані таго выкладчыка, што яе прывёў у студыю, ужо й двух былых студэнтаў не стала, а вось гэтая істота ўсё існуе, непатрэбная нікому...

А была яшчэ адна вар'ятка ў Вільні – насіла доўгую зрэбную апранаху і цярновы вянец на галаве. Тая мела звычку ўлазіць у тралейбус праз пярэднія дзверы і крычаць нешта шалёным голасам. Даводзілася перасядаць у іншы тралейбус. Цяпер яе неяк не бачна.

Аднак найбольш славутая іншая пані – яе сустракаў, бадай, кожны жыхар Вільні або госць. Тая любіць пышныя кваціcтыя строі да зямлі, анілінава-яркую расфарбоўку твару, яркія капелюшы, – раз убачыш, не забудзеш. Яна сталася ўжо часткаю краявіду – яе фатаграфуюць турысты, здымкі яе красуюцца ў газетах. І таксама – бессмяротная, яшчэ гадоў дваццаць пяць таму, я памятаю, яна прасіла манеткі "пазваніць". Не ведаю чаму – мо каханне? – але з любога натоўпу яна выдзяляе мяне і кідаецца ў мой бок, хоць я ніколі ёй нічога не даю і ўвогуле стараюся не глядзець у пачварны мярзотны твар... Цяпер у яе новы "імідж" – пышная шлюбная сукня і калматае бруднае футра зверху...

А быў яшчэ такі, што хадзіў з катом на плячы, нічога не прасіў, толькі моўчкі працягваў капялюш.

І якія яны ўсе мілыя і бяскрыўдныя ў параўнанні з вар'ятамі талінскімі – і тымі, хто ўсё граміў, і тымі, хто справакаваў – і хто пад'юджваў з-за высокіх зубчастых сценаў былой сталіцы былой імперыі...

**Алег Аблажэй**

# Фотафакт



**Кола зламалася.** *Мінская вобласць, травень 2007 году.*

# Невядомая Беларусь

**11 траўня** 1888 году нарадзіўся знакаміты амерыканскі кампазітар Ірвінг Берлін, які за жыццё напісаў 800 песень, у тым ліку і самую папулярную ў ЗША — «Божа, блаславі Амерыку» («God Bless America»). Упершыню яна была выкананая на ўсю краіну ў Дзень памінання ў 1933 г. Праз некалькі дзён яе спявала ўся краіна, і хутка песня стала неафіцыйным гімнам ЗША. Сапраўднае імя Ірвінга Берліна — Ізраіль Бейлін. Ён нарадзіўся ў Магілёве ў сям'і кантара мясцовай сінагогі. У 1893 г. будучы кампазітар разам з бацькамі ад'ехаў у ЗША.

**12 траўня** 1921 году беларускі філосаф Ігнат Канчэўскі ставіць кропку ў галоўнай працы свайго жыцця – даследзінах беларускага светагляду "Адвечным Шляхам", — у якой найлепшым чынам акрэсленае месца беларусаў сярод іншых народаў і на шляхах сусветнай геапалітыкі. Гэтая праца неўзабаве з'явіцца асобнай кніжкай пад псеўданімам Ігнат Абдзіраловіч. А яшчэ менш чым праз два гады аўтар памрэ ад сухотаў у віленскім шпіталі.

**14 траўня** 1995 году адбыўся ініцыяваны Аляксандрам Лукашэнкам рэферэндум, на якім расійская мова атрымала ў Беларусі статус дзяржаўнай, а замест гістарычнай сімволікі былі ўведзеныя амаль дакладныя падабенствы герба і сцяга БССР. Апроч гэтага, прэзідэнт атрымаў карт-бланш на эканамічную інтэграцыю з Расіяй і права спыняць паўнамоцтвы Вярхоўнага Савету, якім неўзабаве і скарыстаўся. Фактычна ў краіне быў усталяваны аўтарытарны тып улады, які канчаткова замацуецца на наступным рэферэндуме – у 1996 годзе.

**15 траўня** 1971 году ў Лондане адчынілася беларуская бібліятэка імя Францішка Скарыны – унікальны збор літаратуры з Беларусі і пра Беларусь, роўнага якому няма на Бацькаўшчыне. Кіруе лонданскай бібліятэкай айцец Аляксандр Надсан.

# "ЦІ МАЛА ШТО МОЖА ЗДАРЫЦЦА"

## АЛЬБО КАГО БУДЗЕМ ШКАДАВАЦЬ?




belzhaba.com

Прачытаў у "Блакітным агеньчыку" артыкул "Ці варта апраўдваць сексотаў?", і надта ж ён падаўся актуальным. Бо акурат дзён за дзесяць перад тым давялося размаўляць з жанчынай, якая ў 1940-м нарадзілася ў ГУЛАГу ад бацькоў, рэпрэсаваных з ласкі суседа-сексота. Маці яе, занятая з 5 раніцы да 12 ночы працаю на лесапавале, каб не даць немаўляці загінуць (двух сыноў-немаўлят яна ўжо перад гэтым страціла), мусіла сушыць пялюшкі дачкі, абгарнуўшы іх вакол уласнага цела. Жанчына распавядала пра жыццё-быццё, а мне чамусьці ўвесь час паўставалі перад вачыма тыя мокрыя пялюшкі і той сексот-даносчык. Які ён быў? Чэрствы? Жорсткі? Бесчалавечны? Ці, можа, наадварот, валодаў такой тонкай ды датклівай душою, што яна не дазволіла яму ўрэшце застацца чалавекам?

Вось і дбай тут пра тое, "каб не параніць душу" згаданага ў артыкуле маладога сексота. Ды не проста сексота, а, як вынікае са зместу артыкула, — не слабога цыніка. З генерацыі тых, відаць, найноўшых, што гэтак лёгка выяўляюць цынізм у дачыненні да іншых, але праявы якога (а то і куды меншага зла) так балюча ўспрымаюць у дачыненні да сябе. А калі гэта яшчэ і ўсвядомлены выбар маладога чалавека?

Канечне, галіць пад адзін грэбень усіх нельга. Ведаю аднаго былога сексота, прыкладна равесніка героя артыкула, які зрабіў па маладосці аблудны выбар, але знайшоў у сабе сілы адпрэчыць яго, не зрабіць справаю жыцця. Дык тут і язык наўрад павернецца штосьці маладзёну закідаць.

Кожны наш учынак на некім адбіваецца. Здараецца, што і ламае каго, і калечыць. Са згаданаю на пачатку гэтага допісу жанчынаю мы дамаўляліся па тэлефоне пра сустрэчу дзесьці праз тыдзень. А сталася так, што спаткаліся выпадкова на наступны дзень пасля дамовы. Якое было маё здзіўленне, калі яна дастала з тэчкі, нібыта каб спраўдзіць асобу, хоць я пра тое і не прасіў, выдадзенае аж у 1948 годзе пасведчанне аб рэабілітацыі сям'і. "Вы што, заўсёды яго з сабою носіце?" – спытаў я. – "Заўсёды, вось ужо на працягу больш як 50 гадоў, – адказала мая суразмоўніца і амаль шэптам дадала: – Ведаеце, ці мала што можа здарыцца..."

Гадоў пятнаццаць таму давялося разам выступаць падчас літаратурных чытанняў з цудоўным чалавекам, цяпер ужо нябожчыкам, паэтам Паўлам Прудніквым. На добры раман, пэўна, хапіла б таго, што распавядаў сп. Павел у прыватных размовах у перапынках паміж выступамі пра лагернае жыццё. А заходзіў у аўдыторыю – і быццам падмянялі чалавека: скупа, сцісла, мінімум фактуры. "Чаму так, Павел Іванавіч?" – запытаўся ў яго аднаго разу. – "Ды я і рады быў бы больш распавесці, — адказаў, – але ж дзеці просяць: глядзі, бацька, надта не вымыкайся, мала як можа стацца..." І распавёў пра першае спатканне з сынам ад першага шлюбу, перарванага ў выніку арышту і высылкі ў ГУЛАГ. Як сядзелі ўдваіх – ні свае, ні чужыя – за сталом ды шукалі таго, што хаця б крыху магло зрадніць пасля 40 гадоў адсутнасці ў жыцці адно аднаго.

Вось такія раны душаў, загнаных на паўстагоддзя ў рэзервацыю страху шчыраванкамі завербаваных ды добраахвотных сексотаў. То каго найперш будзем шкадаваць?

Закранула ж тэма яшчэ і таму, што на пачатку году самому давялося з даносчыкам блізка, так бы мовіць, ушчыльную сутыкнуцца. Калі паплылі-паляцелі ў інстанцыі лісты з патрабаваннямі «прынять меры» ў сувязі з публікацыямі ў "Нашай Ніве". І калі аднае радасці з усяго таго заставалася, што не нехта міфічна-старонні, а які-ніякі знаёмы паэт гэныя гнюсныя даносы выдаў "на-гара". Ды яшчэ – што часы, мауляў, не тыя. Часы, можа, і не тыя. А мы? Тым больш, што гадзіннік, у адрозненне ад часу, як ні круці – рэч рукатворная.

**Франц Сіўко, пісьменнік**

## ПАДПІСКА НА СВАБОДУ

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС (ІНДЭКС, ГОРАД, ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА)
SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com)
**Адрас** 220013 г. Мінск, пл.Каліноўскага 1а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Падпісана ў друк** 09.05.2007 22:54